# Рэгістрацыя замежных грамадзян

У адпаведнасці з п. 12 Палажэння аб парадку арганізацыі і правядзення цэнтралізаванага тэсціравання, зацверджанага пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 06.06.2006 № 714, абітурыенты з ліку **замежных грамадзян, асоб без грамадзянства і грамадзян Рэспублікі Беларусь, якія пастаянна пражываюць на тэрыторыі замежных дзяржаў** (далей – замежныя грамадзяне), могуць накіроўваць у пункт рэгістрацыі копію дакумента, які сведчыць асобу (пашпарта, від на жыхарства, пасведчання бежанца), і заяву па пошце або з дапамогай электронных сродкаў сувязі, запоўніўшы яе па сваім выбары на адной з дзяржаўных моў Рэспублікі Беларусь. Пад электроннымі сродкамі сувязі разумеецца запаўненне заявы для ўдзелу ў ЦТ на сайце РІКВ. Адпраўка дакументаў па электроннай пошце для рэгістрацыі на ЦТ не прадугледжана.

1. **Адпраўка заявы па пошце**

Форма заявы для замежных грамадзян (дадатак 7 да Палажэння аб парадку арганізацыі і правядзення цэнтралізаванага тэсціравання) размешчана на сайце РІКВ.

Пералік і адрасы пунктаў рэгістрацыі размешчаны на сайце РІКВ у раздзеле «Пункты рэгістрацыі і правядзення ЦТ».

**Звяртаем Вашу ўвагу, што РІКВ не з'яўляецца пунктам рэгістрацыі і правядзення ЦТ.**

Аплаціць рэгістрацыйны ўзнос за прыём і афармленне дакументаў для ўдзелу ў ЦТ неабходна будзе па прыбыцці ў Рэспубліку Беларусь. Для гэтага трэба будзе:

– **звярнуцца ў пункт рэгістрацыі не пазней чым за адзін дзень да пачатку тэсціравання па вучэбным прадмеце;**

– **атрымаць асабовы рахунак;**

– **унесці плату** за прыём і афармленне дакументаў для ўдзелу ў ЦТ праз сістэму «Разлік» (АРІП), выкарыстоўваючы нумар асабовага рахунку, атрыманага ў пункце рэгістрацыі. Падрабязная інструкцыя па аплаце рэгістрацыйнага ўзносу за прыём і афармленне дакументаў для ўдзелу ў ЦТ прыведзена на сайце РІКВ.

Пры атрыманні пропуска(-аў) для праходжання ЦТ абітурыент прад'яўляе **дакумент, які сведчыць асобу**.

2. **Рэгістрацыя асабіста або праз Інтэрнэт на сайце РІКВ**

Акрамя ўказанага вышэй спосабу рэгістрацыі па пошце, замежныя грамадзяне могуць у перыяд **з 9 красавіка па 22 красавіка** падаць заяву для ўдзелу ў ЦТ адным з пералічаных спосабаў:

– **асабіста** (або праз законнага прадстаўніка ці прадстаўніка, які дзейнічае на падставе даверанасці, пры наяўнасці ўсіх дакументаў згодна з п. 12 Палажэння аб парадку арганізацыі і правядзення цэнтралізаванага тэсціравання), наведаўшы адзін з пунктаў рэгістрацыі, маючы пры сабе дакумент, які сведчыць асобу, або яго копію. Адрасы, тэлефоны, графік работы пунктаў рэгістрацыі размешчаны на сайце РІКВ па адрасе: www.rikc.by;

– **запоўніўшы электронную форму на сайце РІКВ** праз сетку Інтэрнэт па адрасе: my.rikc.by (далей – сістэма папярэдняй рэгістрацыі). Інструкцыя па запаўненні электроннай формы заявы для ўдзелу ў ЦТ размешчана на сайце РІКВ. **Важна! Пры дадзенай форме падачы заявы замежнымі грамадзянамі ім неабходна ўнесці плату за прыём і афармленне дакументаў для ўдзелу ў ЦТ праз сістэму «Разлік» (АРІП) не пазней за 22 красавіка.**

Замежныя грамадзяне, у якіх няма магчымасці ўнесці плату за прыём і афармленне дакументаў праз сістэму «Разлік» (АРІП), могуць зрабіць гэта не пазней за 22 красавіка з выкарыстаннем банкаўскіх плацежных карт, эмітаваных замежнымі банкамі ў межах плацежных сістэм Visa, Mastercard. Пры гэтым па шэрагу плацежных карт некаторых банкаў магчымасць ажыццяўлення плацяжу можа быць недаступная. Па дадзеным пытанні неабходна звяртацца ў канкрэтны банк.

Асобы, якія падалі заяву на ўдзел у ЦТ з дапамогай сістэмы папярэдняй рэгістрацыі праз сетку Інтэрнэт і не ўнеслі плату за прыём і афармленне дакументаў у вызначаны тэрмін, у базу даных зарэгістраваных удзельнікаў ЦТ не ўносяцца і **да ўдзелу ў ЦТ не дапускаюцца.**

Пры першым уваходзе ў сістэму папярэдняй рэгістрацыі абітурыенту з ліку замежных грамадзян неабходна ажыццявіць аўтарызацыю (у полі «Дакумент» выбраць «Пашпарт замежніка» і ўвесці серыю і нумар дакумента, які сведчыць асобу), пазначыць адрас электроннай пошты і атрымаць на яго **код-пароль** для доступу ў асабісты кабінет (асабісты кабінет фарміруецца ў момант першага ўваходу ў сістэму папярэдняй рэгістрацыі). **Дадзены код-пароль абітурыенту**

**неабходна захаваць для далейшага выкарыстання пры наступных уваходах у асабісты кабінет сістэмы папярэдняй рэгістрацыі.**

Пасля запаўнення палёў анкеты і захавання ўведзенай інфармацыі абітурыент **павінен не пазней за 22 красавіка** ўнесці плату за прыём і афармленне дакументаў для ўдзелу ў ЦТ праз сістэму «Разлік» (АРІП) (або здзейсніць плацеж з выкарыстаннем рэквізітаў плацежнай карты, у выпадку калі магчымасці аплаціць дадзеную паслугу праз сістэму «Разлік» (АРІП) няма), **выкарыстоўваючы нумар свайго асабовага рахунку, указанага ў асабістым кабінеце сістэмы папярэдняй рэгістрацыі**. Нумар асабовага рахунку прысвойваецца абітурыенту ў момант фарміравання асабістага кабінета і застаецца нязменным у ходзе правядзення рэгістрацыі на ЦТ бягучага года.

**Асобы, якія падалі заяву з дапамогай сістэмы папярэдняй рэгістрацыі і не ўнеслі плату за прыём і афармленне дакументаў у вызначаны тэрмін, да ўдзелу ў ЦТ не дапускаюцца.**

Абітурыент **пасля ўнясення платы** за прыём і афармленне дакументаў павінен **не пазней за 22 красавіка** асабіста (або праз законнага прадстаўніка ці прадстаўніка, які дзейнічае на падставе даверанасці) **забраць у пункце рэгістрацыі пропуск(-і)**, маючы пры сабе дакумент, які сведчыць асобу, або даведку, якая выдаецца ў выпадку страты (крадзяжу) дакумента, які сведчыць асобу, або копію аднаго з названых дакументаў.

Абітурыенты з ліку замежных грамадзян, якія не маюць магчымасці забраць пропуск(-і) да 22 красавіка (уключна) і якія:

– накіравалі заяву на ўдзел у ЦТ і копію дакумента, які сведчыць асобу, у адрас пункта рэгістрацыі па пошце

**ці**

– падалі заяву на ўдзел у ЦТ з дапамогай сістэмы папярэдняй рэгістрацыі **і ўнеслі не пазней** за 22 красавіка плату за прыём і афармленне дакументаў для ўдзелу ў ЦТ,

**могуць забраць у пункце рэгістрацыі пропуск(-і) не пазней чым за адзін дзень да даты правядзення ЦТ па вучэбным прадмеце.**

**Працэс рэгістрацыі для ўдзелу ў ЦТ лічыцца завершаным толькі пасля атрымання абітурыентам пропуска(-аў).**